# ПЫТАННІ ВЫВУЧЭННЯ ПРЫРОДНА-ЛАНДШАФТНАГА КОДА БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ ЯК СРОДКУ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭТРАНСЛЯЦЫІ КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТУ

**Швед І. А.**
*доктар філалагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры беларускага літаратуразнаўства*
*УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Брэст)*

*Прырода, як метафара, цягнецца да вобразаў,*
*якія гавораць пра нешта больш глыбокае,*
*чым тое, што мы можам спасцігнуць.*

*Рычард Нэльсан*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасная культура, бясспрэчна, генетычна звязаная з самабытным духоўным вопытам мінулага – прычым яго апрадмечаныя формы, часткова захаваўшы сваю арыгінальную існасць, а часткова «пераапрадмеціўшыся», становяцца грунтам новых сінтэзаў, і гэтым падтрымліваюць духоўны патэнцыял культуры. Усталяванне новых адносінаў да міфа як вечна жывога пачатку («філасофія жыцця» Ф. Ніцшэ, А. Бергсана) і вопыт псіхааналізу (З. Фрэйд, К. Юнг) непасрэдна звязаныя з працэсам т.зв. рэміфалагізацыі. Постпазітывісцкая эпоха актывізавала глыбінныя міфа-сінкрэтычныя структуры мыслення, пласты інтуітыўна-цэласнага светапогляду, міфа-рытуальнага светаўспрымання. У гэтым кантэксце асаблівую значнасць набываюць прынцыпы міфалагічнага мадэліравання, якое адбываецца ў розных кодах. Сёння мы з’яўляемся сведкамі таго, як па-новаму рэканструіруюцца, інтэрпрэтуюцца і рэпрэзентуюцца архаічныя сродкі культурнага ўпарадкавання, як праз міфалагічныя вобразы і сюжэты ствараюцца разнастайныя стылізацыі ці варыяцыі на пэўныя тэмы. Разам з тым традыцыйны фальклор, прадстаўлены сёння ў жывым бытаванні, працягвае сцвярджаць праз розныя коды аксіялагічна высоказначныя сутнасці, і многія яго формы не страчваюць сваю грамадска-рэгламентуючую скіраванасць. Менавіта асяроддзе носьбітаў традыцыйнай культуры, фальклору – гэта тая крыніца, якая праз пасрэдніцтва сімвалаў і кодаў працягвае выносіць на паверхню самыя каштоўныя і трывалыя згусткі духоўных энергій, чым уплывае на форматворчасць сучаснай духоўнай эліты. Што да ўмоў індывідуальнай творчасці, то, як слушна адзначалі М. Мамардашвілі і А. Пяцігорскі, «здесь не может повториться продукт, созданный в связи с первичным символизмом, но может повториться тип творца и тип сознательного отношения к символизму. [То есть “сознательного” в нашей терминологии, а в психоаналитической, конечно, – “подсознательного!”]» [3, с. 195]. Як паказвае аналіз твораў розных відаў мастацтва, у прыватнасці беларускай літаратуры, зварот да духоўнага багацця нашых продкаў, да культурна-гістарычнай памяці, рэ-інтэрпрэтацыя міфалагічных матываў, структур, кодаў, якія належаць традыцыйнай культурнай спадчыне беларусаў, дазваляе паэтам і празаікам дасягнуць вышынь мастацка-філасофскага асэнсавання рэчаіснасці, напоўніць сваю творчасць гармоніяй і заглыбленасцю ў існае. Нездарма кожнае новае пакаленне намагаецца «распрадмеціць» атрыманыя ў спадчыну каштоўнасныя формы, «расчытаць» значныя сэнсы і ідэалы, якія рэтрансліруюцца тымі ці іншымі кодамі ў сучасную культуру, адухаўляючы і напаўняючы яе трывалай, жыццёва неабходнай духоўнай энергіяй,

будуючы каштоўнасна важныя культурныя сінтэзы сучаснасці і новыя сэнсажыццёвыя гарызонты, указваючы на звышсэнсы і звышмэты быцця.

Знешняя інтэнсіўнасць працэсаў глабалізацыі і татальнай універсалізацыі існавання, калі адбываюцца сур'ёзныя зрухі ў сістэме каштоўнасна-анталагічных арыентацый, каштоўнасна-сэнсавых прыярытэтаў, актуалізавала праблему ўнутраных канстант культуры, тых яе стрыжнёвых сэнсаў, вобразаў, кодаў, якія вызначаюць анталагічныя і экзістэнцыяльныя вымярэнні прысутнасці чалавека ў культурным ландшафце (шырэй – у космасе). Перажыванне свету як такога, што знаходзіцца ў пераходным стане, выклікае ўзмацненне неспакою і актывізуе эсхаталагічную міфалогію і адпаведныя архаічныя комплексы, архетыпы, коды. Гэта матывуе рост цікавасці да касмаганічных і касмалагічных канструкцый этнічных культур, прыродна-ландшафтнага кода. Між тым праз актуалізацыю архаічных чыннікаў названага і іншых кодаў космас чалавека традыцыйнага і космас чалавека сучаснага зближаюцца, у выніку чаго мы атрымліваем мажлівасць карыстацца выпрацаванымі культурай ахоўнымі механізмамі, якія скіраваныя на пераадоленне нігілістычна-разбуральных пачаткаў, паніжэнне ўзроўню неспакою і няўпэўненасці. Адсюль – абвастрэнне навуковай і грамадскай цікавасці да механізмаў і сродкаў рэтрансляцыі жыццёва важных, правераных часам сэнсаў і самабытных формаў беларускай традыцыйнай культуры, якія, можна спадзявацца, дапамогуць вызначыць шляхі гарманізацыі сучаснага грамадства, выпрацаваць жыццяздольныя формы духоўнасці.

Калі фальклор гістарычны паводле сваёй прыроды, то яго коды гістарычныя двойчы – не толькі таму, што коды функцыянуюць выключна ў гістарычным развіцці, але яшчэ і таму, што яны паводле сваёй прыроды з'яўляюцца апрадмечанымі каштоўнаснымі ўтварэннямі, скіраванымі на захаванне і рэтрансляцыю ў дыяханаіі і сінхраніі культурнага ландшафту, каштоўнасна значных сэнсаў культуры. Архаічныя ў сваёй аснове сімвалы і коды, рэтраслірюючы ператвораны ў каштоўнасныя ідэалы сацыяльна-культурны вопыт, прад'яўляюць кожнаму пакаленню імператывы дзейнасці, спосабы асэнсавання, узнаўлення рэчаіснасці, крытэрыі яе ацэнкі (сенсорнай, сублімiраванай, рацыяналістычнай). Сімвалы і коды не толькі суадносяцца з каардынатамі свету і ў канцэнтраванай форме выяўляюць і рэтраслірююць розныя аспекты рэчаіснасці, але і з'яўляюцца яе параджаючай і пераўтвараючай мадэллю. А таму могуць уздзейнічаць на сучаснае і будучае гэтай рэчаіснасці.

Прыродна-ландшафтны код – інструмент традыцыйнага мадэліравання свету на аснове яго пазнання, ацэнкі і апісання праз сімвалы мора, ракі, возера, балота, гары, даліны, каменя, лесу, саду, поля, лугу і іншых прыродна-ландшафтных рэалій. Кожная з гэтых семіятызаваных міфапаэтычным мысленнем рэалій функцыянуе ў беларускім фальклоры як сімвал – адмысловы вобраз, які з'яўляецца вынікам і ідэальнай формай прадметна-пачуццёвага, цэласнага, эмацыянальнага адлюстравання прадметаў і з'яў матэрыяльнага свету. Генезіс чыннікаў прыродна-ландшафтнага кода мае глыбока архаічную прыроду; яны захоўваюць і рэтраслірююць значныя тэксты (у семіятычным сэнсе) беларускай традыцыйнай культуры, трывала функцыяніруюць у яе дыяхраніі і сінхраніі. Прыродна-ландшафтны код выступае адным з вызначальных чыннікаў знакавай сістэмы беларускага фальклору і функцыяніруе як універсальны сродак апісання, кансервацыі і рэтрансляцыі ў часе і прасторы адпаведнага культурнага ландшафту – тэрытарыяльнага прыродна-культурнага асяроддзя развіцця пэўнага мясцовага грамадства ці этнасу, створанага і/ці засвоенага пэўнай грамадой людзей. Яго асноўнымі чыннікамі выступаюць: прыродны ландшафт, грамада людзей у іх этналагічным, сацыяльным, сямейным, канфесійным і іншых аспектах; гаспадарчая дзейнасць; сістэма рассялення як спосаб прасторавай арганізацыі/самаарганізацыі грамады ў прыродным ландшафце; моўная сістэма; духоўная культура (сфера

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вераванняў, рытуальнай практыкі, фальклорная карціна свету, якая развіваецца па законах крышталю, што адлюстроўвае і праламляе, але ў той самы час прабывае-ў-сабе). Падкрэслім, што ў адносінах да прыродна-ландшафтнага кода ўсе чыннікі культурнага ландшафту, за выключэннем моўнай сістэмы, з'яўляюцца аб'ектамі апісання, якія, як вядома, структурыруюць змястоўны (сюжэты, матывы, вобразы), паэтычны і функцыянальны (кантэксты бытавання і мэтавыя ўстаноўкі) планы тэкстаў. Гэтае палажэнне, думаецца, павінна быць пакладзена ў аснову міждысцыплінарнага вывучэння прыродна-ландшафтнага кода міфапаэтычнага мыслення. Адзначым таксама, што кола вераванняў, звязаных з прыродна-ландшафтнымі аб'ектамі, складае найважнейшы змястоўны стрыжань усёй беларускай традыцыйнай культуры, бо ў тэкстах, якія іх афармляюць, фіксуюцца найбольш значныя з міфалагічнага пункту гледжання і даволі ўстойлівыя чыннікі архаічнай этнакультурнай інфармацыі.

Без сістэмнага аналізу семантыкі і сімволікі прыродна-ландшафтных аб'ектаў, прадстаўленых, у першую чаргу, у фальклоры і абрадавай дзейнасці, немагчыма комплексна даследаваць пэўны культурны ландшафт, паколькі грамадства асвойвае прастору не толькі тэрытарыяльна, але і семантычна і сімвалічна; з фенаменалагічнага пункту гледжання ландшафт з'яўляецца прасторай сэнсаў. (На тое, што «ў канчатковым выніку ўсю міфалогію можна размясціць у межах канцэптуальнага комплексу "Чалавек" – "Прырода"», указвала, у прыватнасці, С. Кашарная [2, с. 73]). «Для средневекового человека природа была "великим резервуаром символов"», – адзначаў А. Гурэвіч [1, с. 63]. Нездарма культурны ландшафт разглядаецца сучаснымі вучонымі як прыродна-культурнае асяроддзе фарміравання і захавання мастацтва, з аднаго боку, і даследуецца ландшафтафарміруючая роля мастацтва, з іншага.

У сувязі са сказаным на першы план выходзяць тэарэтыка-метадалагічныя праблемы даследавання мадэліруючай функцыі прыродна-ландшафтнага кода, характарыстыкі (на новым узроўні навук) міфапаэтычных уяўленняў беларусаў аб прыродна-ландшафтных аб'ектах, выхначэння семантыкі і функцыянавання асноўных прыродна-ландшафтных сімвалаў беларускага фальклору і іх сувязі з міфа-рытуальнай традыцыяй. На сучасным этапе вывучэння гэтага фрагмента культуры важным з'яўляецца яго сістэмнае апісанне з улікам разгорнутых у прасторы разнастайных дыялектных формаў мясцовых уяўленняў пра свет, адпаведных вераванняў, сістэмы ацэнак і каштоўнасцяў. Своечасовай можна лічыць пастаноўку наступных пытанняў: характарыстыка міфалагем (ідэалагічных канцэптаў, культурных сімвалаў), якія прасвечваюць скрозь чыннікі прыродна-ландшафтнага кода; вызначэнне прагматыкі прадстаўленых у жывым бытаванні аповедаў аб прыродна-ландшафтных аб'ектах, а таксама каштоўнасных арыенціраў, нарматыўных прадпісанняў, якія яны актуалізуюць у адносінах да гэтых аб'ектаў. Яшчэ адно кола задач звязана з пастаноўкай пытання пра формы актуалізацыі вераванняў, звязаных з прыродна-ландшафтнымі аб'ектамі, у розных сферах народнай культуры: у абрадавай традыцыі, фальклорных тэкстах, народнай тэрміналогіі і фразеалогіі, пра формы рэпрэзентацыі міфапаэтычных уяўленняў аб прыродна-ландшафтных аб'ектах у сучасных відах мастацтва.

Як фалькларыстыка, так і сумежныя з ёю дысцыпліны, асабліва этналінгвістыка, кагнітыўная антрапалогія зацікаўленыя ў абгрунтаваным вырашэнні пазначаных навуковых праблем. Але ў гэтым зацікаўлена і грамадства, бо карані сучаснай культуры – у прошлым, у фальклоры, у традыцыйнай культуры нашых продкаў, якія надзвычай актыўна семіятызавалі навакольныя прыродна-ландшафтныя аб'екты. Праблематыка міфапаэтычных уяўленняў беларусаў аб прыродна-ландшафтных аб'ектах, у прыватнасці семіятызацыі ракі, крыніцы, балота, лесу, поля і пад., дэманструе несумненную даследчую перспектыву і з пункту гледжання этнакультурнага ландшафтазнаўства, у якім культурны ландшафт разумеецца як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прырodна-культурнае асяроддзе развіцця пэўнага мясцовага грамадства ці этнасу. Праз пасрэдніцтва прыродна-ландшафтнага кода і сёння рэтрансліруецца значымая інфармацыя, звязаная з пэўнымі базавымі сэнсамі, здзяйсняецца рэтрансляцыя самой традыцыйнай і сучаснай культуры.

***Літаратура***


1. Гуревич, А. Избранные труды: в 2 т. Т. 2: Средневековый мир / А. Гуревич. – М. –СПб.: Университетская книга, 1999. – 560 с.
2. Кошарная, С. А. Миф и язык: Опыт лингвокультурологической реконструкции русской мифологической картины мира / С. А. Кошарная. – Белгород: Изд-во Белг. Гос. ун-та, 2002. – 288 с.
3. Мамардашвили, М. К. Символ и сознание. Метафизические рассуждения о сознании, символике и языке / М. К. Мамардашвили, А. М. Пятигорский. – М.: Школа «Языки русской культуры», 1997. – 224 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ